■ Фотафакт

Па вуліцы...тхара вадзілі!

Трымаць у якасці хатняга гадаванца ката ці сабаку, час ад часу выгульваючы іх на павадку... Каго гэтым цяпер здзівіш! Вось тхор — зусім іншая справа.

Мінчанку Надзею і яе шуструю «кампаньёнку» па мянушцы Нюрка мы сустрэлі каля пажарнай часці на вуліцы Машынабудаўнікоў, акурат падчас прагулкі.

— Гэта хатні тхор. Яму ўсяго толькі восем месяцаў, мы яшчэ расцём, — распавяла жанчына.

Аказваецца, Нюрка пасялілася ў яе сям'і невыпадкова. Бацька Надзеі, калі тая была яшчэ дзіцем, неяк прынёс у дом маленькага дзікага тхорыка, якога яму падараваў сябар-паляўнічы. Неўзабаве тхор стаў любімцам усёй сям'і. Прайшоў час, і ўжо дзеці самой Надзеі задумаліся пра тое, якога б гадаванца завесці. Так склалася, што спыніліся на тхары, толькі ўжо хатнім.

Фота Надзеі БУЖАН.

І ні разу не пашкадавалі. Нават муж Надзеі, які быў катэгарычна супраць любой жывёлы ў доме, не ўстаяў перад «абаяльнасцю» тхара. Нюрка вельмі пацешная, цікаўная і любіць гуляцца з дзецьмі.

Карміць пушыстага непаседу можна птушыным мясам, некаторымі відамі рыбы, кашамі. А таксама — якасным сухім кормам. Бавіць час ён заўжды «з карысцю»: гуляе з цацкамі, заглядвае ва ўсе куты кватэры. Так што калі аднойчы прынесяце такую істоту ў сваё жытло, сумаваць вам дакладна не давядзецца.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■ Інфарм-укол

«ХРАНІЧНЫЯ» МІНДАЛІНЫ БУДЗЕМ ВЫДАЛЯЦЬ

Адэноіды — захворванне, якое вельмі рэдка сустракаецца ў дарослых, чаго не скажаш пра дзяцей. Чаму так адбываецца? Як лячыць такіх дзяцей?

Як вядома, міндаліны дапамагаюць любому з нас змагацца з бактэрыямі, што трапляюць у глотку пры дыханні і ўжыванні ежы, спрыяюць фарміраванню мясцовага імунітэту — абараняюць ад узбуджальнікаў захворванняў. З 2 да 7 гадоў міндаліны працуюць вельмі напружана, паколькі пашыраецца колькасць кантактаў з навакольнымі, у выніку чаго дзіця хварэе на рэспіраторныя захворванні.

Паводле слоў **валеолага 23-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ,** пры недастаткова моцным імунітэце — з-за спадчынных асаблівасцяў, экалагічных фактараў і іншых прычын — лімфоідныя органы павялічваюцца ў аб'ёме. Павелічэнне міндалін паднябення называецца «гіпертрафія паднябенных міндалін», або танзіліт. Павялічэнне, хранічнае запаленне глотачнай міндаліны называецца «адэноідамі».

Адэноіды спрыяюць і падаўжаюць хваробы трахеі і бронхаў — бранхіт, абструктыўны бранхіт, трахеіт, фарынгіт, могуць выклікаць або ўзмацніць праявы алергіі (у цяжкіх выпадках — бранхіяльную астму, алергічную рынапатыю, атапічны дэрматыт). Шматразова павялічваецца верагоднасць запаленчых працэсаў у глотцы, гартані, трахеі, бронхах, лёгкіх — а гэта ангіны, ларынгіты, трахеіты, бранхіты, пнеўманіі. Дрэннае дыханне праз нос спрыяе няправільнаму развіццю прыкусу, твару («адэноідны твар»).

ШТО СПРЫЯЕ АДЭНОІДАМ?

✓ спадчыннасць;

✓ запаленчыя хваробы носа, горла, глоткі, рэспіраторныя вірусныя інфекцыі, адзёр, коклюш, шкарлятына, ангіны і інш.;

✓ парушэнне харчавання — перакормліванне;

✓ схільнасць да алергічных рэакцый;

✓ парушэнне аптымальнай вартасці паветра (надта цёпла, вельмі суха, шмат пылу, лішак бытавой хіміі, шкодныя рэчывы ў паветры).

— Калі дзіця часта пакутуе ад насмарку, які доўжыцца 10 дзён і больш, горш дыхае

носам, храпе падчас сну, пачало недачуваць (перапытвае, павялічвае гук тэлевізара), неабходна наведаць оталарынголага.

— Нельга дапускаць разрастання адэноідаў.

Адэноіды абавязкова трэба лячыць! Толькі не адэноіды, а хранічны запаленчы працэс у іх. Каб прадухіліць ускладненні.

ЯКІМ МОЖА БЫЦЬ ЛЯЧЭННЕ?

Мясцовае. Кроплі, арашэнні слізістай носа і насаглоткі воднымі растворамі з супрацьзапаленчай, антыалергічнай і антымікробнай вартасцямі.

Агульнае. Вітаміны, сродкі, якія ўздзейнічаюць на імунную сістэму, вакцыны, фізіятэрапія (магніта-, лазератэрапія, інгаляцыі).

Гамеапатыя. Не проціпаказана.

Калі выяўляюцца змяненні з боку вушэй (атыт, дысфункцыя слыхавых труб), хранічныя бронхалёгачныя захворванні, алергіі, то адэноіды, незалежна ад ступені іх павелічэння, абавязкова выдаляюцца. На сёння менавіта выдаленне з'яўляецца самым эфектыўным метадам лячэння адэноідаў.

Аперацыя выконваецца ў спрыяльны для дзіцяці час. Нельга выконваць яе падчас вострых рэспіраторных захворванняў і 3–4 тыдні пасля выздараўлення. Дзецям да 8 гадоў — без мясцовага абязбольвання, пасля 8 гадоў слізістая насаглоткі змазваецца або арашаецца растворам лідакаіну. Малым дзецям гэта не робіцца з-за небяспекі развіцця асфіксіі (удушша). Аперацыя не хваравітая і доўжыцца ўсяго 5–6 секунд. Ускладненні бываюць вельмі рэдка. Ад выдалення адэноідаў ультрагукам і лазерам хірургі адмовіліся з-за больш высокай рызыкі ўскладненняў.

Звычайна дзіця знаходзіцца ў стацыянары адны суткі.

ШТО РАБІЦЬ ПАСЛЯ ВЫПІСКІ ДАДОМУ?

У ложку трымаць дзіця не трэба, дастаткова толькі абмежаваць фізічную нагрузку. 3–5 дзён не ўжываць гарачую і вострую ежу, кіслыя сокі і фрукты, газіраваныя напоі і марожанае. На 3–5 суткі пры адсутнасці павышанай тэмпературы, добрым зажыванні ранкі ў глотцы можна наведваць дзіцячы калектыў і выходзіць на вуліцу. Нельга толькі займацца спортам і наведваць басейн.

Поўнасцю рана ў глотцы зажывае праз 2–3 тыдні. Праз месяц ніякіх абмежаванняў у ладзе жыцця і харчавання няма.

Адэноіды могуць пасля выдалення з'яўляцца зноў. Здараецца гэта ў 5 працэнтах выпадкаў. Аднак гэта не азначае неабходнасці паўторнага хірургічнага ўмяшання. Адэноідная тканка можа з'яўляцца ў насаглотцы не раней як праз 7–12 месяцаў. За гэты час паспявае аднавіцца функцыя слыхавых труб, носа. Урэшце, з ростам дзіцяці павялічваецца аб'ём насаглоткі. Такім чынам, адноўленыя міндаліны не здольны аказаць ранейшы адмоўны ўплыў. Паўторнае выдаленне адэноідаў патрабуецца надзвычай рэдка.

САМАЕ ВАЖНАЕ Ў ПРАФІЛАКТЫЦЫ:

1. Загартоўванне з першых месяцаў жыцця.
2. Фізкультура і спорт.
3. Своечасовае лячэнне любых захворванняў верхніх дыхальных шляхоў.

Святлана БАРЫСЕНКА

Даты | Падзеі | Людзі

1789 год — 225 гадоў таму нарадзіўся (горад Мінск) Юзэф Главацкі, беларускі жывапісец, графік, тэатральны мастак. Вучыўся ў Віленскім універсітэце ў Яна Рустэма, затым выкладаў там перспектыву і кіраваў літаграфскай майстэрняй. Афармляў спектаклі ў тэатрах Мінска, Вільні, Варшавы. Аўтар літаграфіі з выявай віленскага касцёла св. Ганны, партрэтаў архітэктара Л. Стоўка-Гуцявічуса, жонкі, аўтапартрэта, маляўнічай кампазіцыі «Евангеліст Марк», пейзажаў, малюнкаў. Памёр у 1858 годзе.

1850 год — нарадзілася Соф'я Кавалеўская, сусветна вядомы матэматык, пісьменніца, публіцыстка, першая ў свеце жанчына-прафесар, член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук. Нарадзілася ў Маскве ў сям'і генерала В. В. Корвін-Крукоўскага, які паходзіў са старажытнага шляхецкага роду з Беларусі. Ранняе дзяцінства і юнацтва правяла ў радавым маёнтку бацькі ў вёсцы Палібіна тагачаснай Віцебскай губерні. Атрымала ўсебаковую адукацыю. Выдатныя матэматычныя здольнасці выявіліся ўжо ў раннім дзяцінстве. Доктар філасофіі, прыват-дацэнт Маскоўскага матэматычнага таварыства, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навукі. Дасягнуць у другой палове XIX стагоддзя такога навуковага прызнання было для жанчыны з'явай надзвычайнай. Матэматык Соф'я Кавалеўская з дзяцінства ўражвала знаёмых сваімі здольнасцямі да навук. Не маючы магчымасці вучыцца ў Расіі, яна ў 1869-м паступіла ў Гейдэльбергскі універсітэт. Затым брала ўрокі ў знакамітага матэматыка Карла Веерштраса ў Берліне. А званне доктара філасофіі Кавалеўскай прысудзілі ў Гётынгенскім універсітэце. Соф'я Кавалеўская стала прафесарам кафедры матэматыкі ўніверсітэта Стакгольма. Яна — аўтар шматлікіх прац па матэматычным аналізе, механіцы і астраноміі.

1939 год — 75 гадоў таму нарадзіўся (вёска Заполле Шклоўскага раёна) Васіль Васільевіч Шынкароў, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук (1991). Аўтар навуковых прац па праблемах дзяржаўнага будаўніцтва, мясцовага самакіравання, аграрнай палітыкі, ідэалогіі дзяржавы, заканатворчасці.

Было сказана

Аляксандр ЕЛЬСКІ, пісьменнік, этнограф, гісторык, перакладчык, публіцыст:

«Калі бліжні церпіць бяду, то трэба яго падтрымаць, хоць бы ён і саромеўся такой дапамогі».

Віншую любую **Ангеліну Ісідараўну ПЯТРОВІЧ** з 55-годдзем нашага шлюбу!

Сустрэў цябе я нечакана
І выпадкова, можа быць,
Ды лёсам нам наканавана
Больш за паўвека разам жыць.

Удзячны я табе за гэта —
За выбар твой і за любоў.
Пераканаўся: у цэлым свеце
Лепш за цябе
я б не знайшоў!

Твой Васіль.

Слова падзякі

Дзякуй «Звяздзе», якая знайшла магчымасць павіншаваць на самым фінішы года лётчыка-касманаўта СССР Пятра Ільіча Клімука, яго жонку Лілію Уладзіміраўну, сына Міхаіла і яго сям'ю з Новым годам, а таксама 40-годдзем з дня першага палёту ў космас. Вялікага сямейнага шчасця Вам і здароўя!

З павагай,
Мікалай Іванавіч ПАЎЛЮКОВІЧ,
старшыня райкама прафсаюза работнікаў АПК Брэсцкага раёна.

УНП 200498559

■ Апавяданне

Сюжэтная калізія гэтага кароткага апавядання знітавала ў сабе столькі драматычных момантаў, што, абапіраючыся на іх, хто-небудзь іншы замахнуўся б на цэлы раман. Зрэшты, у Аляксандра Горбача, магчыма, усё яшчэ наперадзе.

Як бы там ні было, хацелася б звярнуць увагу чытачоў на яго ўменне выстройваць дынамічны сюжэт і прыдумляць нечаканую канцоўку...

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Алесь БАДАК.

Аляксандр ГОРБАЧ

ЭКСТРАСЭНС

Вясковы гаварун і вастраслоў Мішка Мядзянік стаяў сярод гандлёвай залы сельмага і ўскліквў разгублена і здзіўлена:

— Яму месца ў «Бітве экстрасэнсаў»! Што ён робіць у нашай вёсцы? Кажа, дай мне руку... І вось, зараза, гледзячы на далонь, расказаў усё!.. І што я быў жанаты, якое імя былой жонкі, як даўно разышліся. Нават ад чаго памерла мая маці! — Мішка аж пацёр далонню аб штаны, пазіраючы на здзіўленых вясковых баб.

Ні адной з жанчын, якія стаялі ў сельмагу і чакалі прывозу хлеба, не знайшлося што адказаць. Затое не змаўчаў Федзя Крот — здаравенны, нібы бык, крыху нецвярозы мужчына пенсійнага ўзросту, які больш за 40 гадоў адпрацаваў у мясцовым калгасе і мінулай зімой пайшоў на пенсію.

— Дык, можа, угадаў? Не? Гм... Прыехаў, халера ведае, адкуль, купіў Зосьчыну хату. Навошта маладому хлопцу хата ў сяле? Дзівак... Дурань, а не хірамант! — зарагатаў Федзя, але яго і смех ніхто з прысутных не падтрымаў.

— Вось зараз і ўпэўніцеся, які ён экстрасэнс, — ціха і стомлена прамовіла прадавец Жанна, высокая хударлявая дзяўчына. — Вунь, бачу, ідзе ў магазін... Зноў, напэўна, па «Кока-колу» і цыгарэты.

У сельмаг зайшоў невысокага росту каржакаваты малады мужчына. На выгляд яму было гадоў каля трыццаці. Штосьці няўстойлівае, трапяткое хавалася ў поглядзе яго блакітных пранізлівых вачэй. Так і хацелася зірнуць як мага глыбей у гэтыя нібыта ў чымсьці вінаватыя вочы. Прыцягваў позірк доўгі тонкі шрам, які вертыкальна цягнуўся ад левага брыва да сківіцы.

Усе прыціхлі. Незнаёмец дастаў маленькі чорны партманет... Але тут на ўвесь магазін прагучаў трубны голас Федзі Крата:

— Кажуць, слаўны экстрасэнс прыехаў у наша сяло? Хір-р-амант! — выцягнуўшы сваю вузлаватую мазолістую далонь, Фёдар зрабіў вялікі крок наперад, прыціснуў незнаёмца да прылаўка і насмешліва спытаў-загадаў:

— Паваражы, хлопец!

— Не тут, дзядзя, — глухім басам няўпэўнена прамовіў малады мужчына. — «Кока-колу» і пачак «Бонда», калі ласка...

Прыціснуты да прылаўка вялізным, нібы гара, Федзем і адчуваючы, як свідруюць спіну і патыліцу насцярожаныя погляды вясковых жанчын, «экстрасэнс» адчуваў сябе няўтульна. Вялізная далонь Фёдара гіпнатызавала. Стала зразумела: проста так адсюль незнаёмец не выйдзе. Некалькі секунд здранцвела і скасавурыўшыся ён глядзеў на далонь былога механізатара.

— Рука працоўнага чалавека, — няўпэўнена прамовіў незнаёмец. — За рулём усё жыццё...

— Ха! — гаркнуў на ўвесь магазін раптам павесялеўшы Фёдар. — Дык любая баба, глянуўшы на маю далонь, скажа тое самае!.. Гм, нейкім дзіўным ты здаешся, хлопец. А можа, цябе за каўнер і...

Вочы «экстрасэнса» ўспыхнулі ад гневу. Адчувалася, ён ледзь стрымлівае сябе, утаропіўшыся ў далонь Фёдара:

— Гэта не ўсё, паважаны!.. Вы — чацвёртае і апошняе дзіця ў сваіх бацькоў. Усе, хто старэйшы, памерлі... І жонка загінула з-за вас: бачу поле, камбайн, жанчыну, што ўпала пад жняярку. Вы вінаваты ў яе смерці, але чамусьці вас не пакаралі... Гм, вось дзіва!.. Дык вы нават ажаніліся з сястрой загінулай жонкі!..

Фёдар адхапіў руку, нібыта хтосьці лінуў на яе кіпнем. Адна з жанчын пранізліва войкнула на ўвесь магазін. Незнаёмец забраў з прылаўка «Кока-колу», пачак цыгарэт і ціха выйшаў. Усе літаральна аслупянелі. Толькі прадавец Жанна, нібыта нічога не здарылася, нахмурыўшыся, стала падлічваць выручку.

***

У двор Зосьчынай хаты, дзе пражываў вышэйзгаданы «экстрасэнс», няспешна зайшла вясковая жанчына Ліда Каленік. Яна працавала ў дзіцячым садку. Яе дзявоцкая прыгажосць паступова перайшла ў мілую жаночую прывабнасць. Ліда падабалася многім мясцовым мужчынам, што ліплі да яе, як мухі на мёд. Але на сэрцы ў гэтай мілавіднай жанчыны быў камень: тры гады як знік яе муж — паехаў на заробкі і, як кажуць, прапаў з канцамі.

З веранды насустрач госці хуценька выйшаў той самы «экстрасэнс». Ён адчуваў сябе неяк неспакойна: паспешліва прапанаваў Лідзе сесці на лаўку, сам тут жа прысеў, потым ускочыў...

— Вас Алег клічуць? — пільна ўглядаючыся ў вочы незнаёмцу, спытала Ліда. — Уся вёска толькі гаворыць пра вас — вы ўразілі ўсіх! Неверагодна! Але мяне чуткі цікавяць мала. Скажыце, вы хірамантыяй валодаеце?.. Прапаў муж — няма спакою! Свякроў вас ўсім абвінавачвае мяне, але... яна старая жанчына, я ёй дарую... Што з маім Аляксеем?

— Так, я, ведаеце... я займаюся даўно... і жыву за гэта... ў вывучэнне жаночай далоні, якая лягла на яго калена. Твар яго асвяціўся ўсмешкай. Доўга маўчаў, пасля ўзняў на жанчыну свае блакітныя вочы.

— Бачу, сябравалі з мужам з дзяцінства... Гм, а зацяжаралі вы яшчэ да вяселля. Аляксей прыязджаў на вяселле з арміі — адпусцілі на такую важную падзею... Жылі дружна, дзве дачкі, але, ведаеце, бачу брунетку. І муж ваш знаёмы з ёй вельмі даўно... Можа, у арміі пазнаёміўся? Скажыце свекрыві: жывы ён, здаровы... Больш нічога не магу сказаць. Не хачу вас траўміраваць.

...Ліда плакала. Алег ускочыў, кінуўся ў веранду, прынёс кубак вады, але жанчына адвяла яго руку з кубкам і, нахіліўшы галаву і ўздрыгваючы плячыма, пайшла да веснічак. «Экстрасэнс» паставіў кубак, хуценька пералічыў грошы, потым нейкі час мітусліва перакладваў іх з кішэні ў кішэню.

...У самы бліжэйшы час да «хіраманта» ў двор Зосьчынай хаты пайшлі вяскоўцы — і маладыя, і старыя. Асабліва шмат ішло жанчын, дзяўчат. Малады чалавек толькі паспяваў лічыць і складваць грошы.

Было відаць, што грошы ён любіў.

***

Аўтамабіль стаяў у самым канцы вуліцы... Ужо амаль сцямнела; жыццё ў вёсцы заціхала, толькі не заціхаў вецер — шалёна і неўтаймавана ён матлошыў голле яблынь і старога клёна... Да аўтамабіля падышла высокая хударлявая дзяўчына — гэта была прадавец сельмага Жанна; яна адчыніла дзверы, села на пярэдняе сядзенне. За рулём аўто сядзеў той самы «экстрасэнс» Алег.

Абое маўчалі.

— Можа, хопіць, Алег, падманваць вяскоўцаў? — з болем у голасе нарэшце спытала Жанна. — Гэтыя людзі табе не чужыя, а ты... Дарэчы, прыязджаў участковы міліцыянер, вельмі зацікавіўся расказамі пра твае... фокусы, але, мусіць, не ведае, як падступіцца. Глядзі, прыцягнуць за махлярства...

— Хіба ты не ведаеш, Жанна, што толькі з-за цябе я ўзяўся за гэтыя... фокусы? Каб зарабіць, вярнуць тваё каханне і забраць цябе з сабой! — з нечаканай злосцю загаварыў Алег. — Думаеш, мне лёгка? Я ледзь трываю: яны глядзяць — і не пазнаюць мяне... Хаця, што дзіўнага: чатыры гады калоніі, пасля тая страшная траўма, перасадка скуры, устаноўка касцявога імплантата на твары. Добра зрабілі аперацыю медыкі — паспрабуй даведацца, што тут пластыка... толькі шрам... Той жа Федзя Крот — стрыечны брат маёй маці... Думаеш, мне хацелася нагадваць яму пра смерць жонкі пад жняяркай камбайна? Лёгка гаварыць ім пра іх мінулае, бо амаль усё ведаю, ды цяжка выдумваць пра будучыню... Жанна, любая мая, паехалі са мной!

— Алег, нікуды я не паеду. Тут маці хворая, тут... Ты столькі гадоў памятаў пра мяне, кахаў, але... я ўжо іншая. Я не замужам, але сэрца маё несвабоднае, Алег, прабач... Тут ёсць настаўнік малады. Ён... думаю толькі пра яго... Ты — дзіўны! Няўжо мужчыны могуць так доўга кахаць?

— Могуць! Толькі вось жанчыны схільныя да здрады! — злосна выпаліў Алег. — Забяры гэтыя грошы — іх цэлы пакет, мне яны не патрэбны. У Мінск я еду ўжо зараз.

— І мне не трэба гэтыя грошы: яны зароблены падманам. Занясі лепш у царкву... Хаця і ў царкву такія грошы нядобра несці, — прамовіла Жанна і выйшла з аўтамабіля.

Выйшаў і «экстрасэнс». Маладыя людзі стаялі насупраць адно аднаго. Шалёны вецер яшчэ больш усхадзіўся, Жанна ўжо не папраўляла прычоску, а проста трымала валасы... Алега душыла крыўда і рэўнасць, а Жанна была спакойнай і абыякавай.

Трэба было развітвацца.

— Не возьмуць грошы нават у царкве? То няхай імі распараджаецца вецер! — ускрыкнуў са злосцю Алег, ускінуў уверх і рвануў пакет...

Дзясяткі, сотні паперак дружна ўзняліся і закруціліся ў паветры; вецер падхапіў іх і панёс уздоўж вуліцы. Толькі адна 50-тысячная купюра зачапілася за антэну аўтамабіля і трапяталася, нібы матылёк. Алег са злосцю адчыніў дзверы аўто, сеў, запусціў рухавік. Праз некалькі секунд машына ўжо неслася ў бок аўтамагістралі. Жанна з сумнай усмешкай глядзела ўслед; яе думкі былі пра маладога настаўніка, які заўтра раніцай абавязкова прыйдзе ў сельмаг...

***

Назаўтра ўся вёска толькі і гудзела пра тое, што хтосьці высыпаў мех з грашыма на вуліцы. Чуткі хадзілі проста неверагодныя: спачатку гаварылі, што абрабавалі нейкіх інкасатараў. Але верх узяла іншая думка: гэта — грошы «хіраманта», якога як быццам захапілі і вывезлі ў Маскву. Калгасны пастух Рыгор, як і вясковыя дзеці, чуткамі не цікавіўся, а збіраў грошы, да абеду наступнага дня ён ужо меў «на рахунку» каля трох мільёнаў.

...Няшчасная Ліда Каленік у тую раніцу, ідучы на працу ў дзіцячы садок, знайшла каля плота 100-тысячную купюру. Добрая сэрцам, Ліда пайшла ў царкву, купіла і паставіла свечку «о здравии» мужа. Няхай яму Бог дасць здароўя, нават калі ён там, у Падмаскоўі, бавіць час... з той ненавіснай брунеткай.

СЁННЯ

Месяц

Поўня 16 студзеня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. Ульяны, Серафіма, Сільвестра.
К. Арнольда, Ізыдара, Макара, Паўла.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.20	17.18	7.58
Віцебск	9.16	17.02	7.46
Магілёў	9.10	17.08	7.58
Гомель	8.59	17.12	8.13
Гродна	9.34	17.35	8.01
Брэст	9.27	17.43	8.16

Фота Анатоля КІЕЩЧУКА.

ЗАЎТРА



Геамагнітныя ўзрушэнні

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура

...у суседзяў

ВАРШАВА -3..-1°С	КІЕЎ -3..-1°С	РЫГА -7..-5°С
ВІЛЬНЮС -8..-6°С	МАСКВА -9..-7°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ -12..-10°С

УСМІХНЕМСЯ

Што павінен умець мужчына:
1) Не маўчаць, калі прыгатавана смачна.
2) Моўчкі есці, калі не смачна.

— Давай, проста пасядзім моўчкі? Тут так прыгожа, не хачу парушаць гэтую цішыню...
— Цягніце білет!

У маршрутцы, набітай чыноўнікамі, грошы да вадзіцеля так і не дайшлі.

Дзяўчына — хлопцу:
— Тата хоча з табой бліжэй пазнаёміцца.
— Пасля таго, як ён дзве гадзіны з сякерай ганяўся за мной па раёне? Ты здзекуешся?
— Не, ты яму спадабаўся. Ён майстар спорту па бегу.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.817. Індэкс 63850. Зак. № 251.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 студзеня 2014 года.